Няхай і надалей замацоўваецца аўтарытэт Праваслаўя

Яго Святарскасці Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу

Ваша Святарскасць, Сардэчна віншую Вас з 5-годдзем інтранізацыі.

Ваша жыццё з'яўляецца для святароў і вернікаў прыкладам няспыннага клопату аб людзях у імя ўмацавання веры, хрысціянскай любові і міру. Вы робіце ўсё для ўдасканальвання сучаснага грамадства, спрыяючы выхаванню моладзі, умацаванню сям'і, захаванню праваслаўных традыцый і каштоўнасцяў.

У многім дзякуючы Вашаму плённаму служэнню як Прадстаяцеля Рускай Праваслаўнай Царквы, які рупіцца аб духоўна-маральным адраджэнні, перамозе сапраўднага гуманізму, развіваюцца добрыя, партнёрскія адносіны паміж Дзяржавай і Царквой.

Найбольш значная канфесія ў Беларусі — Праваслаўная Царква — з'яўляецца непарыўнай сувязной ніткай нашых брацкіх народаў, а вытокі гэтага адзінства сфарміраваны тысячагадовай гісторыяй. Няхай і надалей пад Вашым мудрым кіраўніцтвам замацоўваецца аўтарытэт Праваслаўя.

Ад усёй душы зычу Вам, Ваша Святарскасць, здароўя, даўгалецця, невычэрпнай энергіі, дапамогі Божай у першасвяціцельскай працы.

З глыбокай павагай,

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

БУЙНЫЯ МЕДЫЯХОЛДЫНГІ, ЯКАСНЫЯ «РАЁНКІ», ЗАХАВАННЕ АЎДЫТОРЫІ

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асабліва актыўным стала абмеркаванне дзейнасці тэлевізійнай галіны. Спачатку міністр паведаміў аб тым, што «лідзіруюць ў інфармацыйнай прасторы краіны традыцыйна электронныя СМІ (тэлебачанне і радыё). Разам з тым назіраецца зніжэнне іх аўдыторыі, што тлумачыцца, сярод іншага, павелічэннем колькасці карыстальнікаў інтэрнэту». Аднак тэлебачанне развіваецца: летась пачалі вяшчанне два новыя тэлеканалы — «Беларусь-3» і «Беларусь-5». Старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька нават заявіў, што «стварэнне новых тэлеканалаў прайшло без прыцягнення дадатковых сродкаў з бюджэту і (што вельмі важна) кантэнту расійскіх тэлеканалаў. Гэта каналы цалкам з нашым кантэнтам». Але потым ён раскрыў перад прысутнымі складаную праблему: «Большасць тэлеканалаў рэгіянальнага маштабу вельмі часта выкарыстоўваюць «скрадзены» кантэнт. У іх можна паглядзець учарашнюю галівудскую прэм'еру, якую Белтэлерадыёкампанія не можа набыць, бо гэта вельмі дорага. А з раённым тэлебачаннем ніхто не будзе судзіцца, таму яны і могуць паказаць нейкі шэдэўр. А ўнізе экрана падчас паказу будуць ісці радкі: «Саша віншуе Машу...» З гэтым трэба змагацца. Таму я хачу папрасіць Алега Вітольдавіча (міністр інфармацыі. — **Аўт**.), каб была нейкая канкрэтная ініцыятыва ад нашых заканадаўчых органаў, каб, можа быць, унесці нейкія змены ў закон аб СМІ, датычныя абароны аўтарскіх правоў».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ГЕРОЙ НАШАЙ ГІСТОРЫІ

Іван Ільіч Кустаў — адзін з Герояў Савецкага Саюза, салдат Вялікай Айчыннай вайны. Лёс даў яму жыць у XXI стагоддзі. З вышыні пражытых дзевяноста гадоў яму добра відаць гісторыю незалежнасці нашай Радзімы, якую давялося абараняць на палях вайны. І ў мірны час Іван Ільіч заставаўся воінам-абаронцам: служыў Айчыне — навучаў маладых салдат, працаваў з моладдзю.

У зале адміністрацыі Партызанскага райвыканкама Мінска, дзе адбылася ўрачыстая сустрэча, прысвечаная святкаванню 90-годдзя Івана Ільіча Кустава, было цесна ад гасцей. Незанятымі пакінулі некалькі метраў каля Дзяржаўнага сцяга і сцяга горада Мінска — на гэтае, самае ганаровае месца быў запрошаны паважаны юбіляр.

Віталі Івана Ільіча мінчане розных узростаў, былі сярод іх яго аднагодкі і тыя, хто па ўзросце падыходзіў у сыны і ўнукі. Вялікае жыццё, вялікія справы, вялікае кола сяброў-аднадумцаў! Вітаць ветэрана прыйшлі кіраўнікі раёна, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, армейцы. Не злічыць цёплых слоў падзякі і пажаданняў, не выказаць хвалявання, з якім выступалі сівыя ветэраны і маладыя гараджане.

Але самымі хвалюючымі сталі імгненні, калі прагучалі радкі з архіўных ваенных дакументаў. Высокае званне Героя Савецкага Саюза Івану Ільічу Куставу было прысвоена за кіраванне боем у час кровапралітнага фарсіравання заходняга прытока Віслы — аднаго з самых цяжкіх баёў Вісла-Одэрскай аперацыі. «...За два дні баёў ротай пад камандаваннем капітана Івана Кустава было знішчана 210 і захоплена ў палон 25 гітлераўцаў».

Быў тады Івану Куставу ўсяго 21 год.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

■ Парламенцкі дзённік

СУСВЕТНЫ БАНК ЗРАБІЎ АНАЛІЗ БЕЛАРУСКАГА БЮДЖЭТУ

Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па бюджэце і фінансах сумесна з дэлегацыяй Сусветнага банка абмеркавала складзены экспертамі Сусветнага банка праект ацэнкі эфектыўнасці кіравання дзяржаўнымі выдаткамі і фінансавай справаздачнасці ў 2010—2012 гадах. Першая такая ацэнка ў Беларусі была праведзена Сусветным банкам за перыяд з 2008 па 2010 год, і тады эфектыўнасці кіравання дзяржаўнымі фінансамі ў нашай краіне была дадзена адзнака «4» па пяцібальнай шкале.

Праект ацэнкі за новы перыяд уключае шэсць модуляў: рэалістычнасць; паўната і празрыстасць бюджэту; адпавяданне задачам і палітыцы; знешні кантроль і аўдыт; прадказальнасць і кантроль у працэсе выканання; улік, вядзенне дакументацыі і справаздачнасць. У абмеркаванні і разглядзе гэтага праекта бралі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў фінансаў, эканомікі, казначэйства, дзяржаўнага кантролю.

30 студзеня ў Палаце прадстаўнікоў адбылося пашыранае пасяджэнне Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах, на якім ішла гаворка пераважна аб шостым модулі аналітычнага дакумента, прысвечаным кантролю і аўдыту.

— Наша задача — удакладніць пэўныя моманты па праекце, яшчэ раз расказаць, як парламент удзельнічае ў працэсе прыняцця бюджэту і справаздачы па яго выкананні, і, магчыма, паўплываць на павышэнне рэйтынгу Беларусі па некаторых крытэрыях, — патлумачыла журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла ДАБРЫНІНА.** — Мы ўдзельнічалі ў прэзентацыі праекта, ведаем, што ў цэлым ацэнка нядрэнная. Галоўнае, што, нягледзячы на нестабільнасць макраэканомікі, бюджэтная дысцыпліна не пагоршылася. Нам таксама ўдалося не дапусціць скарачэння капітальных расходаў у сацыяльнай сферы, і гэта важна, бо наш бюджэт мае сацыяльны напрамак. Эксперты станоўча адзначылі нашы дасягненні і пастаянны характар удасканалення падатковай сістэмы і адміністравання.

— Праца па праекце яшчэ не скончана, але асноўны аналіз завершаны, — пацвердзіла на сустрэчы з беларускімі парламентарыямі **старшы спецыяліст экспертнай групы Сусветнага банка па пытаннях дзяржаўнага сектара Алена НІКУЛІНА,** — таму мы разаслалі гэты праект усім зацікаўленым бакам, каб адбыўся дыялог і мы былі ўпэўнены, што засноўваем свае высновы на праверанай інфармацыі.

Пасля канчатковага абмеркавання з усімі зацікаўленымі бакамі праект разам з рэкамендацыямі па ўдасканаленні кіравання дзяржаўнымі фінансамі будзе прадстаўлены ўраду. «Каб яшчэ раз паглядзець, як змянілася эфектыўнасць кіравання дзяржаўнымі фінансамі, — сказала Людміла Дабрыніна. — Адпаведна будуць прапанаваны кірункі па ўдасканаленні дзейнасці, якія і мы возьмем за аснову ў сваёй рабоце над адпаведнымі законапраектамі».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

Паспець набыць айчынныя сувеніры

Міністэрства гандлю выступіла з заклікам да арганізацый гандлю, індывідуальных прадпрымальнікаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, прыдарожнага сэрвісу, бытавога абслугоўвання, якія вядуць рэалізацыю тавараў з лагатыпам чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2014 года, актывізаваць іх продаж.

З 9 лютага па 25 мая беларускімі вытворцамі спыняецца вытворчасць, а таксама рэалізацыя ў гандлёвай сетцы шэрагу тавараў з лагатыпам чэмпіянату. Міністэрства звяртае ўвагу, што тавары без лагатыпу чэмпіянату з іншымі адлюстраваннямі на хакейную тэматыку («Мінск-2014», «Хакей-2014», «Хварэем за нашых» і г.д.) рэалізуюцца без абмежаванняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Гучная справа

Бацька памерлай Юліі Кубаравай: «НЕ СТРАШНА, КАЛІ Б СОТНІ ДЗЯЎЧАТ БЫЛІ КІРПАТЫМІ...»

Анестэзіёлага «Экамедсэрвіса» асудзілі да 4 гадоў калоніі

У судзе Кастрычніцкага раёна Мінска агучылі прысуды вінаватым у смерці Юліі Кубаравай з Гродна. Маладая дзяўчына памерла пасля пластычнай аперацыі па карэкцыі формы носа ў камерцыйным медыцынскім цэнтры «Экамедсэрвіс». За аперацыю дачкі сям'я Кубаравых заплаціла Br15 млн.

Былога анестэзіёлага «Экамедсэрвіса» суд прызнаў вінаватым у неналежным выкананні службовых абавязкаў, якія прывялі па неасцярожнасці да смерці пацыенткі. Яго асудзілі да 4 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі-пасяленні. Там жа, але толькі на працягу 3 гадоў, будзе адбываць пакаранне і былы галоўны інжынер медцэнтра за службовую халатнасць. Былая гендырэктар «Экамедсэрвіса» атрымала 2 гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчыя ўстановы закрытага тыпу. Акрамя таго, усім траім забаранілі займацца медыцынскай дзейнасцю на працягу 5 гадоў.

Падчас судовых слуханняў урач-анестэзіёлаг прызнаўся, што не сказаў кіраўніцтву аб тым, што апарат штучнага дыхання, які даў збой падчас аперацыі Юліі Кубаравай, трэба адрамантаваць. Хоць ведаў, што шкляная колба таго апарата была пашкоджана. Ён палічыў, што герметычнасць апарата не парушана і яго можна выкарыстоўваць. Страшна ўявіць, што на тым абсталяванні, колба якога была заклеена скотчам, рабілі аперацыі з лістапада 2012-га па сакавік 2013 года(!).

Як высветлілася, падчас аперацыі Юліі Кубаравай у аперацыйнай знаходзіўся яшчэ адзін апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх. Ён, як правіла, выкарыстоўваўся для правядзення кароткачасовых аперацый. Аднак пасля збою асноўнай апаратуры ім не скарысталіся. Замест гэтага ўрач ажыццяўляў ручную вентыляцыю лёгкіх пацыенткі. Паводле яго слоў, наладжваць і падключаць другі апарат у момант збою не было часу. А паколькі асноўнае абсталяванне наладзілі параўнальна хутка, неабходнасць у выкарыстанні іншага апарата адпала...

Пасля аперацыі Юліі Кубаравай анестэзіёлаг папрасіў калег не гаварыць ні з кім пра тое, што здарылася. Сам ён паведаміў гендырэктару пра тое, што падчас аперацыі адбыўся збой апаратуры, толькі пасля таго, як у медцэнтры пачалося ўнутранае расследаванне трагедыі.

Маці Юлі па-ранейшаму лічыць, што ў смерці яе дачкі вінавата ўся медыцынская брыгада, якая праводзіла аперацыю. «Самае страшнае, што медыкі ўтаілі праўду пра стан Юлі і не далі апошняга шанцу нашай дзяўчынцы — шанцу на жыццё. Я расцэньваю гэта як злачынства. Яны не думалі пра нашу дачку, думалі пра сябе, пра тое, як пазбегнуць пакарання. Яны павінны адказаць за няспраўджаныя надзеі маёй дачкі, за яе ненароджаных дзяцей».

Суд таксама задаволіў грамадзянскі іск бацькоў Юліі Кубаравай. На працягу месяца «Экамедсэрвіс» павінен выплаціць Кубаравым амаль Br75 млн у якасці кампенсацыі матэрыяльнай шкоды, а таксама па Br500 млн кожнаму з іх у якасці кампенсацыі маральнай шкоды.

«Наш іск аб кампенсацыі маральнай шкоды не значыць, што нам патрэбны гэтыя грошы за смерць нашай дзяўчынкі, — адзначыла маці загінулай Юлі. — Я скарыстаюся гэтымі грашыма, каб лячыць іншых дзяцей. Можа быць, мы яшчэ камусьці дапаможам». Бацька ж памерлай дзяўчыны адзначыў, што «не страшна, калі б сотні дзяўчат былі лапавухімі ці кірпатымі, яны засталіся б жывымі». І сказаў, што трагедыя іх сям'і павінна стаць урокам усім медыцынскім установам.

Надзея ПАЎЛАВА.

ЭКС-СТАРШЫНЯ НАГЛЯДАЛЬНАГА САВЕТА БАНКА ПРЫГАВОРАНЫ ДА 7 ГАДОЎ

Былы старшыня наглядальнага савета ААТ «Тэхнабанк» Уладзіслаў Кацарэнка прыгавораны ўчора да сямі гадоў пазбаўлення волі з адбываннем ва ўмовах узмоцненага рэжыму, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА старшы памочнік пракурора Мінска па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Сяргей Балашоў.

Як вынікае з крымінальнай справы, Уладзіслаў Кацарэнка, у тым ліку прадастаўляў прыватным кампаніям падробленыя дакументы і рэквізіты падкантрольных яму лжэпрадпрымальніцкіх структур — рэзідэнтаў іншых краін. Ён быў затрыманы 2 сакавіка 2012 года.

У верасні таго ж года Валерый Вакульчык, які ў той час узначальваў Следчы камітэт Беларусі, паведаміў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА, што Кацарэнка падазраваўся ў стварэнні арганізаванай злачыннай групы і кіраванні ёю. Ён быў абвінавачаны па чатырох артыкулах: у крадзяжы шляхам злоўжывання службовым становішчам, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, ухіленні ад выплаты падаткаў і махлярстве. У пракуратуры Мінска адзначылі, што прыгавор вынесены менавіта па гэтых артыкулах, без змяненняў.

«Кацарэнка дапамагаў кіраўнікам прыватных кампаній ухіляцца ад выплаты падаткаў і збораў, прадастаўляючы ім падробленыя дакументы і рэквізіты падкантрольных яму лжэпрадпрымальніцкіх структур — рэзідэнтаў Расійскай Федэрацыі, краін Балтыі, Вялікабрытаніі. Таксама Кацарэнка абвінавачваецца як кіраўнік групы, якая займаецца незаконным абменам валюты», — заявіў Валерый Вакульчык, каменціруючы гэту справу.

■ Факт

ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў ПЕТРЫКАВЕ АДНАВІЛІ

10 шматпавярховых дамоў у Петрыкаве (662 жыхары) некалькі гадзін заставаліся без вады. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС расказалі, што разрыў быў зафіксаваны а 9 гадзіне раніцы.

Аварыйная брыгада знайшла месца пералому чыгуннай трубы на глыбіні каля 2 метраў. Для таго, каб ліквідаваць аварыю, было адключана халоднае водазабеспячэнне дамоў па вуліцах Люксембург і Вароўскага, праведзены работы па адпампоўцы вады на пашкоджаным участку і герметызацыі трубаправода. Бліжэй да вечара водазабеспячэнне было адноўлена. Папярэдне прычынай разрыву называецца знос водаправода, пабудаванага ў 1973 годзе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДА ДЗІКОЎ ЗНАЙШЛІ ІНШЫЯ «ПАДЫХОДЫ»

На тэрыторыі краіны спрошчаны парадак здабычы дзікоў.

Як паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі, змены ў дзейнае Часовае палажэнне аб асаблівым выкарыстанні рэсурсаў дзіка на тэрыторыі Беларусі ўнесены пастановай Савета Міністраў №70. Дакумент афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале і ўжо ўступіў у законную сілу.

Згодна з ім, падоўжана паляванне на дзіка спосабамі з падыходу, з засады. Здабываць жывёлу можна з 1 студзеня па 30 красавіка бягучага года, што, на думку спецыялістаў, дазволіць актывізаваць тэмпы вымання дзіка з дзікай прыроды.

Пры здабыванні дзіка на тэрыторыях, названых у пункце 3 Часовага палажэння, у тым ліку ў зонах спакою паляўнічых угоддзяў, перададзеных у арэнду ці прадастаўленых у бескарыслівае карыстанне, атрыманне дазволаў Мінпрыроды на выманне дзікіх жывёлін з асяродку іх пражывання не патрабуецца. Яшчэ адно новаўвядзенне — здабыванне дзіка можа весціся без зацвярджэння планаў вымання гэтага віду, а таксама без абмежаванняў па колькасці дзікіх жывёл, што здабываюцца, іх полу і ўзросту. Гэтыя захады павінны садзейнічаць максімальнаму зніжэнню колькасці папуляцыі дзіка на тэрыторыі краіны.

Мерапрыемствы па дэпапуляцыі дзіка, нагадаем, звязаны найперш з успышкамі афрыканскай чумы свіней.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

строительства жилых домов № № 10,11 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минского области

Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства жилых домов №№ 10,11 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минского области, опубликованной в газете «Звязда» 3 октября 2013 г. (№ 186 (27551)).

Информация о застройщике

Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» (ООО «Витасанплюс»).

Место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, д. 61, помещение 515.

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Государственная регистрация застройщика: Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 4 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038, в результате реорганизации путем преобразования Частного строительного унитарного предприятия «Витасанплюс», зарегистрированного решением Минского городского исполнительного комитета от 27 июля 2001 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038.

В течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, ООО «Витасанплюс» принимало участие в строительстве жилого дома по переулку Томскому, д. 35 в г. Минске. Фактический срок строительства данного жилого дома составил 16 месяцев.

Информация об объекте строительства

Цель строительства: строительство жилых домов № 10,11 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минской области.

Этапы и сроки реализации строительства: начало строительства — 2 квартал 2013 г., ввод дома в эксплуатацию – 2 квартал 2014 г., благоустройство и озеленение – 2 квартал 2014 г.

Государственная экспертиза проектной документации: дом № 10 – экспертное заключение от 26.12.2012 г. № 3438–70/12 с дополнением от 31.01.2013 г. № 261–70/13Д, дом № 11 – экспертное заключение от 27.11.2012 г. № 3084–70/12 с дополнением от 31.01.2013 г. № 260–70/13Д, выданные Дочерним Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза по Минской области».

Местонахождение строящихся многоквартирных жилых домов: Минская область, Минский район, аг. Сеница, район улиц Набережной, местного проезда, ул. Я. Купалы, ул. Коммунальной.

Характеристика строящихся многоквартирных жилых домов: два 10-этажных 49-квартирных односекционных жилых дома с техподпольем (типовые блок-секции БС–41 серии М111-90 производства ОАО «МАПИД»). Фундаменты – железобетонные сваи с монолитным железобетонным ростверком. В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. Системы отопления – горизонтальные двухтрубные, ветки систем монтируются из полиэтиленовых труб, проложенных в подготовке пола в защитной гофрированной трубе. В качестве нагревательных приборов к установке приняты радиаторы стальные панельные тип «Лидея». Водоснабжение запроектированных объектов предусматривается от наружной сети водопровода. Для поквартирного учета холодной и горячей воды предусмотрены счетчики СВХ-15 и СВГ-15. В каждой квартире предусмотрено устройство внутриквартирного пожаротушения. В жилых домах выполняются автоматизированные системы контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ-быт). Для телефонизации объектов проектом предусматривается построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, цифрового телевидения и интернета. Установка оптических сетевых терминалов (ONT), которые включаются в абонентские розетки и обеспечивают подключение телефонных аппаратов, телевизионных приемников и компьютеров выполняется РУП «Белтелеком». Общее количество квартир в домах №№ 10,11 – 98, в том числе: однокомнатных – 40 ед., двухкомнатных – 38 ед., трехкомнатных – 18 ед., четырехкомнатных – 2 ед. Чистовая отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется.

Количество предлагаемых объектов долевого строительства: 9 единиц.

Цены на объекты долевого строительства:

однокомнатные квартиры – **12 000 000** рублей за 1 кв.м. общей площади;

двухкомнатные квартиры – **11 500 000** рублей за 1 кв.м. общей площади;

трехкомнатные квартиры – **9 500 000** рублей за 1 кв.м. общей площади;

четырехкомнатные квартиры – **9 000 000** рублей за 1 кв.м. общей площади.

Условия оплаты: уплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. По соглашению сторон, уплата цены объекта долевого строительства может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке:

изменение статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ;

изменение законодательства об уплате косвенных налогов.

Права застройщика на земельный участок: решение Минского районного исполнительного комитета (Минский райисполком) от 10 июня 2013 г. № 3308 «О разрешении на строительство»;

Свидетельство (удостоверение) № 600/212 – 17397 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 623686605101001077, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, площадь – 0,7040 га, назначение – земельный участок для строительства комплекса многоэтажных жилых домов не повышенной комфортности (№ 10, 11 по генплану), составлено Республиканским унитарным предприятием «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 21 мая 2013 г.

Границы земельного участка: с запада – ул. Набережная, с юга – ул. Коммунальная, с востока – ул. Я. Купалы, с севера – местный проезд.

Площадь земельного участка: 0,7040 га.

Элементы благоустройства: проектом предусмотрено полное благоустройство территории с организацией подъезда, парковками общей вместительностью на 24 машино-места, тротуаром для пешеходов шириной 1,5 м, дорожки и площадки к жилому дому из бетонной плитки. На территории строительства жилого дома запроектирована площадка для чистки вещей, площадка для отдыха и детская игровая площадка. Территория оборудуется малыми формами архитектуры. Транспортное обслуживание жилого дома предусмотрено с ул. Я. Купалы.

Количество в строящихся жилых домах и иных объектах недвижимости самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода жилых домов в эксплуатацию:

Общее количество квартир – 98 ед., в том числе:

однокомнатных квартир – 40 (общая площадь от 44,87 кв.м. до 48,55 кв.м.);

двухкомнатных квартир – 38 (общая площадь от 57,87 кв.м. до 60,72 кв.м.);

трехкомнатных квартир – 18 (общая площадь 81,41 кв.м.);

четырехкомнатных квартир – 2 (общая площадь 106 кв.м.).

Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме: на первом этаже запроектировано помещение электрощитовой. Техподполье дома предназначено для размещения инженерных сетей.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

Предполагаемый срок ввода многоквартирных жилых домов в эксплуатацию: 30 мая 2014 года.

Договор строительного подряда: дом № 10 – договор строительного генподряда № 48/05–13 от 17.06.2013 г., дом № 11 – договор строительного генподряда № 49/05–13 от 17.06.2013 г., заключены Застройщиком с Открытым акционерным обществом «МАПИД».

Условия ознакомления с объектом долевого строительства: ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – Частного риэлтерского унитарного предприятия «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 61, офис 517 (тел. 8–017–2–900–901, 8–029–1–907–901) или на сайте **vivainvest.by.**